**Алесь Дуброўскі**

Алесь Дуброўскі нарадзіўся 24 чэрвеня 1948 года ў вёсцы Целяшы Гомельскага раёна. Пасля заканчэння мясцовай сярэдняй школы працаваў будаўніком, служыў у арміі. У 1969 годзе паступіў на падрыхтоўчае аддзяленне Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, а ў 1970 годзе — на першы курс гісторыка-філалагічнага факультэта. Пасля вучобы ў ГДУ працаваў карэспандэнтам Гомельскай раённай газеты 'Маяк'. Зараз — загадчык аддзела інфармацыі Гомельскага абласнога тэлерадыёаб'яднання.

Першы верш быў надрукаваны ў Гомельскай раённай газеце 'Маяк' у 1967 годзе. Затым друкаваўся ў 'Гомельскай праўдзе', 'Знамени юности', 'Чырвонай змене', 'Сельской газете', 'Літаратуры і мастацтве', часопісе 'Маладосць", літаратурным альманаху "Магістраль'. Вершы А. Дуброўскага — пра перажытае, непасрэд- ныя І шчырыя. У іх адчуваецца радасць быцця і шчымлівае прадчуванне хуткаплыннасці звычайнага зямнога шчасця. Паэтыка яго твораў зведала грунтоўны ўплыў фальклору.